

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

# Газета Слонімская

№43 (281) 24 — 30 кастрычніка 2002г. Наклад 11.700 экз. Кошт 300 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by


# ГОНКА ЗА МЕДАЛЯМИ



Фота Віталя ГІЛЯ



Фота Віталя ГІЛЯ

С 18 по 20 октября в Слониме на набережной Щары возле гребной базы было многолюдно. Здесь проходили соревнования по гребле на байдарках и каноэ на приз Олимпийского чемпиона Владимира Романовского.
**Подробнее читайте на 15 странице.**

**На снимках:**
**вверху** — на дистанции Константин Король и Валерий Дубовик; **слева** — десятки мальчишек наблюдали за соревнованиями; **справа** — Владимир Романовский с именными медалями.



Фота Віталя ГІЛЯ

## УСЕ НА ФУТБОЛ!



Апошні матч сёлетняга чэмпіяната Беларусі па футболу ў першай лізе слонімскі "Камунальнік" праводзіць на **стадыёне "Юнацтва"**. Гульня адбудзецца ў нядзелю, **27 кастрычніка**. Пачатак у **15** гадзін. Кошт білета — **1000** рублёў.

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 10[00] 22.10.2002г.

| | Покупка | Продажа |
|---|---|---|
| **"Беларусбанк"** | | |
| 1 USD | 1855 | 1885 |
| 1 EURO | 1800 | 1850 |
| 1 ZL | 435 | 460 |
| 1 RUR | 57 | 60 |
| **оао "Белпромстройбанк"** | | |
| 1 USD | 1865 | 1883 |
| 1 EURO | 1815 | 1840 |
| 1 ZL | 440 | 460 |
| 1 RUR | 57,5 | 59,5 |
| **"Белагропромбанк"** | | |
| 1 USD | 1860 | 1885 |
| 1 EURO | 1800 | 1845 |
| 1 RUR | 57 | 59,5 |
| **Нацбанк РБ** | | |
| 1 USD | 1877 | |
| 1 EURO | 1830,83 | |
| 1 RUR | 59,22 | |

ВЁСКА

# ЯК ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ?

## ДУМАЛІ І ВЫРАШАЛІ НАЧАЛЬНІКІ АГРАРНАГА СЕКТАРА НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ СЛОНІМСКАГА РАЙВЫКАНКАМА


Фота Віталя ГІЛЯ

*На такім грузавіку далёка не заедзеш*

**І сапраўды — як жыць далей? Менавіта так паставіў пытанне на нядаўнім пасяджэнні Слонімскага райвыканкама яго старшыня Мечыслаў Касцюк не проста так. На пасяджэнні разглядалася праца сельгаспрадпрыемстваў раёна за 9 месяцаў бягучага года і стан падрыхтоўкі гаспадарак да зімоўкі.**

Былі запрошаны кіраўнікі і галоўныя спецыялісты гаспадарак, перапрацоўчых прадпрыемстваў і сельгасупраўлення райвыканкама. У працы пасяджэння выканкама ўдзельнічалі таксама першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама І. Данчанка і намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў РБ С. Здановіч.

Даючы ацэнку працы раённаму паляводству за 9 месяцаў бягучага года, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Валерый Гузень адзначыў, што сёлета хлебаробы сабралі збожжавых 63 147 тон, што на 8,8% больш, чым летась. А вось ураджайнасць бульбы ў гэтым годзе была вельмі нізкай — усяго 76 цэнтнераў з гектара. Кармавых караняплодаў, па прагнозных паказчыках, павінны сабраць не больш як 6 тысяч тон — планавалася 18 тысяч тон.

У жывёлаводаў сёлета вялікія праблемы з кармамі. На адну ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавана ў сярэднім па раёне толькі 8,3 цэнтнера кармавых адзінак. Гэта на 5,1 кармавых адзінак менш, чым патрэбна. А ў такіх калгасах як "Кастрычнік", "Дружба", "Рассвет", "Уперад", "Міжэвічы" кармоў для жывёлы нарыхтавана на зіму ў 2 – 3 разы менш ад неабходнай колькасці. Напрыклад, з запланаваных 78 тысяч тон сіласу гаспадаркі раёна нарыхтавалі толькі 28 тысяч тон.

Старшыням калгасаў давялося тлумачыць, як яны збіраюцца ўтрымліваць жывёлу зімой, калі кармоў назапашана недастаткова. І ў іх тлумачэннях было вельмі мала аптымізму. Так, на пытанне старшыні райвыканкам Мечыслава Касцюка, як думаюць зімаваць у калгасе "Міжэвічы", кіраўнік гэтай гаспадаркі Іван Куляшэвіч адказаў, што нарыхтаваных кармоў хопіць толькі да пачатку лютага будучага года, таму жывёлу, магчыма, прыйдзецца перадаваць у іншыя гаспадаркі.

На пасяджэнні выканкама прагучалі яшчэ многія лічбы, якія праілюстравалі работу сельскай гаспадаркі як за 9 месяцаў бягучага года, так і за апошні час наогул. Старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк канстатаваў той факт, што агульны стан эканомікі аграрнага сектара раёна за апошнія гады значна пагоршыўся. Крэдытарская запазычанасць гаспадарак на 1 кастрычніка складала 10 577 мільёнаў рублёў, даўгі па зарплаце за ліпень – жнівень раўняліся 1006 мільёнам рублёў. А ў такіх калгасах як "Кастрычнік" і імя Леніна на 1 кастрычніка наогул адсутнічалі крыніцы пакрыцця запазычанасці па зарплаце.

Мечыслаў Касцюк зазначыў, што цяперашні стан сельскай гаспадаркі раёна абумоўлены як аб'ектыўнымі прычынамі, так і тым, што кіраўнікі і спецыялісты гаспадарак самаадхіліліся ад пошуку рэзерваў павелічэння аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі. Старшыня райвыканкама сказаў таксама, што да 15 снежня будзе праведзена атэстацыя і дадзена ацэнка працы кіраўнічых кадраў аграсектара.

Тым часам кошт тэхнікі, паліва да яе, мінеральных угнаенняў, ядахімікатаў ды і іншага, што неабходна для паспяховага вядзення сельскай гаспадаркі, у шмат разоў перавышае кошты на сельгаспрадукцыю. А калі сюды дадаць несвоечасовы разлік з калгасамі перапрацоўчых прадпрыемстваў, то гэта якраз і будуць тыя аб'ектыўныя прычыны, ад якіх у многіх кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў, сапраўды, апускаюцца рукі.

На пастаўленае пытанне, як мяркуюць жыць сяляне далей, старшыні калгасаў аптымістычных прагнозаў не даюць альбо проста разводзяць рукамі. Бо колькі ні заклікай працаваць і мысліць па-новаму, аднак пры старой калгаснай сістэме і сённяшняй аграрнай палітыцы дзяржавы ўраджаі драбнеюць, а праблемы ў вяскоўцаў растуць.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ГОРАД

## КАЛІ ПСУЮЦЦА КАТЛЫ, ЛЮДЗІ ЗАСТАЮЦЦА БЕЗ ГАРАЧАЙ ВАДЫ

**Трэці тыдзень жыхары вуліц Брэсцкай, Скарыны, праспекта Незалежнасці, Тапалёвай, Яршова жывуць без гарачай вады, але з цяплом у кватэрах. Увесь гэты час у кацельні на Слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыцы (КПФ), адкуль у дамы на названых вуліцах павінна паступаць гарачая вада, ідзе рамонт катла.**

Справа ў тым, што калі пахаладала і патрэбна было даваць цяпло ў дамы, аказалася, што кацельня не можа адначасова забяспечыць людзей гарачай вадой і цяплом, бо сапсаваны адзін з катлоў. Выбар зрабілі на карысць цяпла і пачалі рамантаваць кацёл. Аднак, рамонт зацягнуўся, а людзей вельмі цікавіць, калі, нарэшце, у іх кватэрах з'явіцца гарачая вада.

Як паведаміў карэспандэнту "ГС" 21 кастрычніка начальнік кацельні КПФ Віктар Крыўда, рамонт катла яны павінны закончыць да 24-25 кастрычніка, і на выхадныя жыхары названых вышэй вуліц змогуць карыстацца гарачай вадой.

Вядома, час, калі сапсаваўся кацёл, не на карысць не толькі жыхарам Слоніма, але і начальству. Тым больш, што падчас гэтага ацяпляльнага сезона, гараджане адчуюць рост аплаты за камунальныя паслугі. Вось-вось прыйдуць квіткі на аплату за ацяпленне, гарачую і халодную ваду і г.д. Па разліках Міністэрства эканомікі Беларусі , за аднапакаёвую кватэру прыйдзецца заплаціць у сярэднім 28 тысяч рублёў, за двухпакаёвую — каля 42 тысяч, а за трохпакаёвую — 57 тысяч рублёў. Пры гэтым, расходы на ацяпленне складуць, прыкладна, палавіну агульнай платы за жыллё. Дарэчы, такія высокія тарыфы толькі на 40 % кампенсуюць затраты на камунальныя паслугі. Таму тарыфы будуць павялічвацца і надалей. Мяркуецца, што ў наступным годзе яны дасягнуць 60 % ад рэальных затратаў, а праз год — усе 80 %. Паўстае пытанне: ці змогуць людзі аплочваць вышэй названыя сумы за камунальныя паслугі пры сённяшніх заробках? І калі ўсё ж змогуць, дык і патрабаванні да камунальных службаў будуць даволі сур'ёзнымі.

**Мікола КАНАНОВІЧ, Сяргей ЧЫГРЫН**

ЭКОНОМИКА

## БЫСТРЕЕ ВСЕГО ДОРОЖАЮТ ПЕЧАТНЫЕ ИЗДАНИЯ

**В нынешнем году в Беларуси быстрее всего дорожают печатные издания.**

По информации Министерства статистики и анализа, за январь-сентябрь стоимость печатных изданий возросла на 50,2 процента, в т.ч. в сентябре — на 4,9 процента.

В целом с начала года потребительские цены повысились на 24,4 процента.

Среди непродовольственных товаров рекордсменом по удорожанию после печатных изданий является бензин — на 38,7 процента, далее следуют велосипеды и мотоциклы — на 35, ковры и ковровые изделия — на 26,8, медикаменты — на 24,2, табачные изделия — на 23,2.

Среди продовольственных товаров заметнее всего увеличилась стоимость картофеля — на 34,4 процента.

**БелаПАН**

КРЫМІНАЛ

## ЗАБОЙСТВА ЗА КРАТАМІ

**Вязень Ваўкавыскай калоніі строгага рэжыму быў забіты падчас бойкі ў камеры.**

Так званай "заточкай" быў забіты ў бойцы ў камеры 50-гадовы вязень. Тры нажавыя раненні сталіся для яго смяротнымі. Уварваўшыся ў камеру, супрацоўнікі аховы калоніі засталі на месцы канфлікту акрываўленае цела.

Па дадзенаму выпадку ўзбуджана крымінальная справа супраць 37-гадовага сукамерніка па артыкуле "Наўмыснае забойства". Следства павіна даць адказ аб матывах забойства, а ахова калоніі аб наяўнасці ў асуджанага халоднай зброі.

**Pahonia.promedia.by**



АКЦЫЯ

## НА АДНАЎЛЕННЕ СТАДЫЁНА САБРАЛІ МАЛА ГРОШАЙ

**180 тысяч рублёў (каля 100 даляраў) было сабрана слонімскімі арганізацыямі падчас суботніка, які прайшоў 19 кастрычніка па ўсёй Гродзеншчыне.**

Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведамілі ў фінаддзеле Слонімскага райвыканкама. Сабраныя сродкі пойдуць на рэканструкцыю спартыўнай базы на вуліцы Камунальнай, 3 у Гродне. Усяго ж, па папярэдніх дадзеных, па вобласці сабралі больш як 180 тысяч даляраў.

Па меркаванню кіраўніцтва стадыёна, сабраных грошай хопіць толькі на складанне праектна-каштарыснай дакументацыі новага стадыёна і дробны рамонт падтрыбунных памяшканняў. Увогуле, на поўную рэканструкцыю 40-гадовага спартыўнага аб'екта неабходна каля 8-9 мільёнаў даляраў.


Ініцыятыва правядзення суботніка належыць Гродзенскаму аблвыканкаму, які такім чынам імкнецца сабраць грошы на рэканструкцыю галоўнай спартыўнай арэны Гродна – стадыёна "Нёман".

Нагадаем, што на гэтым стадыёне праводзіць свае гульні лідэр сёлетняга чэмпіянату Беларусі па футболу гродзенскі "Нёман".

**Захар ШТЭРНА, Вольга ШЫНКЕВІЧ**

НАВІНЫ

## У ГАСЦЯХ – АЛЕГ ЛОЙКА



*Алег Антонавіч Лойка*

**У мінулую пятніцу ў госці да вучняў і настаўнікаў СШ №1 завітаў беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, крытык, перакладчык, наш зямляк Алег Антонавіч Лойка.**

Ён расказаў прысутным пра свае школьныя гады, якія ён правёў у Слоніме ў СШ №1, пра сваю літаратурную дзейнасць. Алег Антонавіч падараваў дзецям і настаўнікам адну са сваіх кніг "Галгофа" з аўтографам.

Усе прысутныя з вялікім задавальненнем паслухалі цікавы аповед нашага знакамітага земляка пра яго навуковую дзейнасць і жыццё.

**Вольга ШЫНКЕВІЧ**

НОВОСТИ

# ЗАКАНЧИВАЕТСЯ ЗАГОТОВКА ОВОЩЕЙ И ФРУКТОВ

**К 25 октября в Беларуси должна завершиться уборка овощей. Об этом недавно заявил начальник отдела по производству и торговле плодоовощной продукцией и картофелем Министерства сельского хозяйства и продовольствия Александр Белоусов.**

Он отметил, что во всех категориях хозяйств Беларуси ожидается собрать 1 млн. 350 тысяч тонн овощей. По его словам, это несколько ниже прошлогоднего показателя (1 млн. 415 тысяч тонн), что объясняется неустойчивой погодой в нынешнем сезоне. Тем не менее, ожидаемый объем производства овощей позволит обеспечить нужды торговли, общепита и промышленной переработки, а также экспортировать 21 тысячу тонн овощей.

По состоянию на 18 октября Слонимским райпо на межсезонный период 2002 – 2003 годов заготовлено: картофеля 115 тонн – планируется 150 тонн; капусты свежей 2 тонны – планируется 40 тонн и 15 тонн квашеной; моркови 8,7 тонны – планируется 25 тонн; свеклы 15 тонн – планируется 25-30 тонн; лука репчатого 1 тонна – планируется 50 тонн; огурцов солёных 5,8 тонны – планируется 7 тонн; помидоров солёных 9,1 тонны – планировалось 9 тонн; яблок мочёных 5 тонн – планируется 6 тонн.

По словам председателя Слонимского райпо Николая Юрчика, необходимое количество овощей и фруктов в ближайшее время будет заготовлено. Овощи и фрукты приобретаются как у местных производителей, так и за рубежом. Правда, как сказал Николай Викторович, покупать яблоки в той же Молдавии им дороговато.

Если к заготовкам райпо добавить частного производителя, который продаёт свою продукцию на рынке, то получается, что Слоним без овощей на зиму не останется. Кстати, в магазинах сейчас картофель реализуется по цене, примерно, 370 рублей за кг, капуста — по 570 –580 рублей, а у частника эти овощи можно купить дешевле.

**Микола КОНОНОВИЧ**




Фота Віталя ГІЛЯ

*Торговля сельхозпродуктами на Слонимском рынке*

ЗДАРЭННІ

## З "МАЗА" ЗНЯЛІ "ЧОРНУЮ" СКРЫНЮ

**На мінулым тыдні з аўтамабіля "МАЗ", які знаходзіўся на адной з гарадскіх стаянак і належыць мясцоваму прадпрымальніку, зладзеі ўкралі тахограф — прыбор, які запісвае параметры работы розных сістэм і вузлоў аўтамабіля накшталт "чорнай" скрыні самалёта.**

Каму і навошта спатрэбіўся гэты прыбор, цяпер высвятляе слонімская міліцыя.

## НАЧНЫ ВІЗІТ У "ГАРНІЗОННЫ"

**Ноччу злодзеі праламалі дах у адным з гаражоў кааператыва "Гарнізонны", што на вуліцы Касаўскі тракт у Слоніме, і ўкралі адтуль лодачны рухавік "Меркуры" амерыканскай вытворчасці і эхалот — прыбор для выяўлення месца знаходжання рыбы ў вадаёмах.**

Ці атрымае назад свае рэчы аматар рыбалкі, цяпер залежыць ад работнікаў міліцыі.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

### Рэдакцыя просіць прабачэння

У "Газеце Слонімскай" (№42 (280) ад 17-23. 10. 2002г.) быў надрукаваны артыкул "Час хамства", дзе аўтар распавядае пра тое, як ён звяртаўся па тэлефоне ў аварыйную службу Слоніма, каб ліквідаваць няспраўнасць водаправода і каналізацыі ў кватэры. Пры гэтым аўтар называе, што званіў у аварыйную службу ААТ "Слонімскі водаканал". Як высвятляецца, Аляксей Якімовіч сапраўды званіў у аварыйную службу, але не "Водаканала", а ў прадпрыемства ацяпляльных кацельняў і цеплавых сетак, якое і адказвае за рамонт і абслугоўванне унутрыдамавых сетак водазабеспячэння і каналізацыі. У сувязі з гэтым, рэдакцыя газеты прыносіць прабачэнне калектыву ААТ "Слонімскі водаканал" за незаслужанае абвінавачванне.

СОЦЫУМ

## У ЛІЦЭІ ПРА ПЕНСІЯНЕРАЎ НЕ ЗАБЫЛІСЯ, ДЫ НЕ ЎСЕ З ІХ ЗАСТАЛІСЯ ЗАДАВОЛЕНЫМІ

**Да Дня пажылых людзей у Слонімскім сельскагаспадарчым ліцэі пенсіянерам, якія прапрацавалі перад выхадам на пенсію ў гэтай навучальнай установе ці яе дапаможнай гаспадарцы пяць і больш гадоў, выплацілі матэрыяльную дапамогу ў памеры васьмі тысяч рублёў.**

Грошы невялікія, але людзям прыемна, што з выхадам на пенсію пра іх не забыліся.

Як паведаміў карэспандэнту "ГС" дырэктар сельгасліцэя Аляксандр Кароль, матэрыяльную дапамогу атрымалі больш як 30 іх былых работнікаў. Некаторыя з гэтых людзей адпрацавалі ў сельскагаспадарчым вучылішчы (а потым і ліцэі) па 20, 30 і больш гадоў. Як сказаў Аляксандр Андрэевіч, матэрыяльная дапамога выплочваецца на аснове палажэнняў "Калектыўнай дамовы" работнікаў ліцэя, пры наяўнасці грошай і, звычайна, прыўрочваецца да нейкіх святаў. Адным з такіх палажэнняў з'яўляецца ўмова, што да выхаду на пенсію чалавек павінен быў прапрацаваць у ліцэі не менш як пяць апошніх гадоў. Палажэнні "Калектыўнай дамовы", патлумачыў Аляксандр Кароль, абмяркоўваюцца і прымаюцца на агульным сходзе работнікаў установы. Інакш кажучы, гэта іх унутраная справа.

Здавалася б, дапамагаць матэрыяльна сваім пенсіянерам — справа ўдзячная. Не многія прадпрыемствы і ўстановы могуць гэтым сёння пахваліцца. Тым не менш, і тут ёсць небяспека некага пакрыўдзіць.

Так у рэдакцыю "ГС" патэлефанавала сланімчанка Ніна Цэзараўна Мароз. Жанчына расказала, што апошнія два гады і некалькі месяцаў да выхаду на пенсію працавала ў дапаможнай гаспадарцы сельгасліцэя цялятніцай і яшчэ год адпрацавала там ужо будучы пенсіянеркай. І вось знаёмая паведаміла ёй, што пенсіянерам даюць у ліцэі матэрыяльную дапамогу. Ніна Цэзараўна прыйшла за грашыма, а там касір сказала, што ёй дапамога не налічана. Жанчына засталася пакрыўджанай. Па яе словах, справа не ў васьмі тысячах рублёў, а ў справядлівасці.

І хоць гэтая гісторыя паказвае на пэўную адноснасць паняцця справядлівасць (бо фармальна дапамога пенсіянерам налічвалася справядліва, згодна адпаведанага дакумента — "Калектыўнай дамовы", а магла быць і зусім не налічана), тым не менш, у дадзеным канкрэтным выпадку, Ніна Цэзараўна можа звярнуцца ў дырэкцыю ліцэя. Як сказаў у гутарцы з карэспандэнтам "ГС" Аляксандр Кароль, пытанне можа быць вырашана ў індывідуальным парадку, калі чалавеку сапраўды патрэбна матэрыяльная дапамога.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ЗДАРЭННІ

## ЗАТРЫМАЛІ З НАРКОТЫКАМІ

**16 кастрычніка работнікі міліцыі затрымалі ў Слоніме двух мясцовых жыхароў С. і Ш., якія мелі пры сабе наркатычныя рэчывы.**

Наркотыкі адправілі на экспертызу. На аснове заключэння эксперта затрыманым затым будзе прад'яўлена абвінавачванне.

## УКРАЛІ АКУМУЛЯТАРЫ І КОЎДРУ

**У ноч з 14-га на 15-га кастрычніка на мехдвары калгаса "Рассвет" Слонімскага раёна пагаспадарылі злодзеі.**

З двух трактароў начныя госці знялі акумулятары, а на складзе прыхапілі коўдру.

## ГАЛОДНЫЯ НАЛЁТЫ

**Як паведамляюць работнікі крымінальнага вышуку, апошнім часам у горадзе і раёне пачасціліся крадзяжы прадуктаў харчавання, дамашняй жывёлы і птушкі з дамоў, хлявоў і падвалаў мясцовых жыхароў.**

Так на мінулым тыдні ў гаспадара дома ў Жыровічах укралі з хлява ўсіх гусей, а ў Слоніме з клеткі мясцовага жыхара забралі труса. У адным з падвалаў дома №70 па Чырвонаармейскай вуліцы злодзеі вынеслі ўсю бульбу і нарыхтаваныя на зіму кансервы.

Па словах работнікаў міліцыі, пры падобных рабаўніцтвах здзіўляе не толькі нахабства злодзеяў, але і бяспечнасць гаспадароў, якія часта пакідаюць сваю маёмасць без нагляду. А ў выніку, яна становіцца лёгкай здабычай нячыстых на руку людзей.

## АБАКРАЛІ КАЛГАС "УПЕРАД"

**Адразу два рабаўніцтвы былі ўчынены на мінулым тыдні ў калгасе "Уперад" Слонімскага раёна.**

З бульбасховішча невядомыя вынеслі каля 300 кг бульбы, а на калгаснай пасецы пашкодзілі каля 20-ці вулляў — шукалі мёд.

Міліцыя праводзіць расследаванне.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

## ГОРЕЛ "ПОЛОНЕЗ"...

**В Слониме в прошлую пятницу на переулке Аптечном в 4.00 вспыхнул автомобиль "Полонез" 1994 года выпуска, принадлежащий гражданке Республики Польша.**

Огнем уничтожено все, что находилось под капотом. А причиной пожара стало замыкание электропроводки.

## ... И САРАЙ

**В деревне Суринка Слонимского района 20 октября загорелся бесхозный сарай.**

Огонь уничтожил крышу постройки. Причина пожара устанавливается.

## СТОРОЖ СПАС 20 МЛН. РУБЛЕЙ

**18 октября, в пятницу, загорелся склад магазина "Мебель", который находится в Слониме на площади Сапеги.**

Причиной пожара стало замыкание электропроводки.

В помещении находилась мебель общей стоимостью в 20 миллионов рублей. Бдительный сторож оперативно вызвал пожарных, поэтому ущерб от возгорания стал минимальным. Огнем повреждено две тумбочки.

**Ольга ШИНКЕВИЧ**

НАВІНЫ

## РЫБУ Ў ЗІМАВАЛЬНЫХ ЯМАХ ЛАВІЦЬ НЕЛЬГА

**Як паведаміў абласны друк, Міністэрства аховы прыроды зацвердзіла пералік зімавальных ямаў для рыбы ў вадаёмах Гродзенскай вобласці.**

У гэтых месцах забаронены прамысловы і любіцельскі лоў рыбы да 15 красавіка 2003 года.

У Слонімскім раёне забаронена лавіць рыбу ў тоні "Плёс", якая знаходзіцца ў цэнтры возера Бяздоннае. У Мастоўскім раёне накладзена забарона на рыбалку ў тоні "Глыбокая", што ў цэнтры возера Азяранскае.

**Мікола КАНАНОВІЧ**

ВОЛКОВЫСК

## УДРУЧАЮЩИЕ ИТОГИ

**В Волковысском районном отделе внутренних дел на оперативном совещании были заслушаны итоги оперативно-служебной деятельности за 9 месяцев текущего года и мерах по её совершенствованию.**

С анализом работы отделений и служб отдела выступил начальник штаба РОВД подполковник Евгений Валюк, который отметил, что произошёл рост преступлений по всем линиям служб. Общий уровень преступности увеличился с 46,4 до 64,4 преступлений. Количество рецидивных преступлений увеличилось — на 42%, групповых — на 12,7%, в состоянии алкогольного опьянения — на 45%, на бытовой почве — на 400%. Причиной роста преступности, как было отмечено в отчёте, стал недостаточный уровень организации работы по её профилактике и предупреждению.

## ПРИГЛАШАЕТ ЦЕНТР

**Сорок два ребёнка получат в этом году помощь в Центре коррекционного обучения и реабилитации.**

Его услугами пользуются дети с комбинированными дефектами, с задержкой психического развития, нарушениями опорно-двигательного аппарата, речевой патологии. С ними работают дефектологи, психолог и психотерапевт, массажисты и социальные педагоги.

## ВОРУЮТ НЕ ПО МЕЛОЧИ

**Днями неизвестные проникли в магазин по улице Рокоссовского, принадлежавший частному предпринимателю Г., и похитили материальные ценности на общую сумму 438 тысяч рублей.**

По данному факту ведётся расследование.

## НОЖ — НЕ ТОЛЬКО КУХОННАЯ УТВАРЬ

**В Волковысскую больницу госпитализирован 54-летний житель г.п. Красносельский с диагнозом "проникающее ранение брюшной полости".**

Установлено, что в результате семейной ссоры ножевое ранение ему нанесла его 26-летняя дочь.

## С МОЛОТКОМ ПОШЁЛ НА ЖЕНЩИНУ

**Возбуждено уголовное дело в отношении 76-летнего гражданина К..**

Он, находясь в состоянии алкогольного опьянения, умышленно избил свою жену, нанеся ей несколько ударов молотком по голове.

**Александр ДАНИЛИН**

ЗЭЛЬВА

# "АЛЁНУШКА" СТАЛА ДАРОСЛАЙ




*Маладым зэльвенцам застаецца толькі гуляць па вуліцах*

**Так сталася, што маленькія зэльвенцы не маюць магчымасці пазабаўляцца на прыстойнай дзіцячай пляцоўцы з каруселямі, альбо пакатацца на горках ці элементарных арэлях.**

Такога месца ў пасёлку ўжо даўно няма. А зусім нядаўна не стала і адзінага ў Зэльве дзіцячага кафэ "Алёнушка". Дакладней, яго пераабсталявалі ў штосьці накшталт моладзевага кафэ.

Адразу там зніклі маленькія столікі, затым знялі шыльду. Да асартыменту прапанаваных прадуктаў(марожанае, сокі, розныя прысмакі) далучыліся віно, каньяк і бутэрброды. Увогуле, прыстойнага кафэ, дзе маладыя людзі маглі б адпачыць і сустрэцца з сябрамі, у Зэльве таксама не існуе. Гадоў пяць- шэсць таму каля цэнтральнай сталоўкі адкрыўся бар. Спачатку там было ўсё цывілізавана. Сурвэткі на століках, вазончыкі з кветкамі, сучасная музыка, бармэн, хочаш пасмаліць — выходзь на вуліцу.... Праз паўгода бар і яго кантынгент значна змяніліся. З-за дыму разгледзець каго-небудзь на адлегласці ў два метры было немагчыма. П'яныя дыспуты наведвальнікаў бара суправаджаліся нецэнзурнай лаянкай неверагоднай колькасцю слоў, не зафіксаваных у слоўніках. А спрэчкі нярэдка тут заканчваюцца амаль што баксёрскімі паядынкамі. Карацей кажучы, моладзевы бар ператварыўся ў сапраўдны каўбойскі тракцір.

Ёсць яшчэ ў Зэльве кафэ "Дарожнае". Сюды звычайна прыходзяць "адпачыць" пасля зарплаты людзі больш сталага ўзросту са своеасаблівым колерам твару. А што тычыцца рэстарана "Зальвянка", то пасля 19 гадзін назваць яго рэстаранам ужо нельга. Меню там ніколі не прапануецца. Сервіроўка большасці сталоў прадстаўлена ў выглядзе вялікай колькасці пустых бутэлек з-пад піва і гарэлкі. А культура абслугоўвання адпавядае патрабаванням асноўнай масы кліентаў, бо большасць наведвальнікаў пра элементарныя асновы этыкету, відаць, нават не чула. Адным словам, арганізацыя адпачынку ў зэльвенскіх прадпрыемствах грамадскага харчавання адбываецца па адным сцэнарыю: прыйшоў, выпіў, закусіў.

Пераўтварэнне дзіцячага кафэ ў дарослае, хутчэй за ўсё, сведчыць аб тым, што вольны час зэльвенскай моладзі мала каго турбуе. Мабыць, такім чынам раённае спажывецкае таварыства вырашыла павялічыць свой даход. А вось маленькім жыхарам пасёлка прыйдзецца развітацца з "Алёнушкай". Бо наўрад ці бацькі дазволяць сваім чадам сядзець у кафэ побач з чужым і не зусім цвярозым дзядзькам.

**Наталля ГЛУШЭНЯ**

МАСТЫ

## ЖАНЧЫНА ВІНАВАТА

**У Мастах, непадалёку ад светлафора, што на вуліцы 30 гадоў УЛКСМ, здарылася аўтамабільная аварыя.**

Яе ўчыніла жанчына, якая, седзячы за рулём машыны, не мела вадзіцельскага пасведчання.

## КАЛЕГІЯ ПРАПАНАВАЛА СКАСАВАЦЬ КАНТРАКТ З ДЫРЭКТАРАМ

**Калегія райсельгасхарчу на сваім пасяджэнні разгледзела пытанне аб стане спраў у раённым унітарным сельгаспрадпрыемстве "Мастаўчанка".**

Гэта прадпрыемства з'яўляецца адстаючым у раёне па ўсіх вытворчых паказчыках. Як сведчаць дакументы пасяджэння, калегія прызнала ва ўсім вінаватым дырэктара Аляксандра Мармыша і прапанавала райвыканкаму скасаваць з ім кантракт.

## АБЯЦАННЕ "ВЫКАНАЎ"

**Падчас сустрэчы намесніка старшыні райвыканкама Генадзя Снітко з жыхарамі дамоў пад № 8,10,12, 14 па праспекце Юнацтва і дома № 2 па праспекце Міра, апошні паабяцаў, што дробныя работы па навядзенню парадку на тэрыторыі двароў і ў пад'ездах дамоў пачнуцца неадкладна.**

І праца, сапраўды, распачалася. Праўда, падсыпкай тэрыторыі двароў ніхто не займаўся, а вось на пад'ездах некаторых дамоў, якія патрабуюць рамонту, з'явіліся наступныя аб'явы: "Дзеля пастаноўкі на чаргу па рамонту вашага пад'езда неабходна ў ЖКГ падаць калектыўную заяўку, а таксама купіць фарбу і іншыя матэрыялы, неабходныя для рамонту".

У іншых пад'ездах жыхары даўно ўжо набылі неабходныя матэрыялы і самі зрабілі рамонт, не дачакаўшыся, калі гэта зробяць будаўнікі камунальнай службы.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

КУЛЬТУРА

# В ГРОДНО СОСТОЯЛАСЬ ПРЕЗЕНТАЦИЯ ЖУРНАЛА

**В Гродно прошла презентация нового негосударственного литературно-художественного издания "Дзеяслоў". Акция состоялась 16 октября в рамках программы "Свободное общество — свободное творчество", которую проводит известная белорусская писательница и общественный деятель Ольга Ипатова.**

Как сообщила БелаПАН О.Ипатова, в презентации приняли участие главный редактор журнала Борис Петрович, а также известные писатели Эдуард Акулин, Сергей Законников и Михась Скобла. Они выступили перед студенческой молодежью в Гродненском государственном университете имени Янки Купалы, Гродненском колледже искусств имени Тётки (Алоизы Пашкевич), а также в мастерской художника Дмитрия Ивановского.

По словам Ольги Ипатовой, "молодые люди очень живо и адекватно реагировали на выступления литераторов и произведения, опубликованные в журнале "Дзеяслоў". Она полагает, что новое издание сегодня является лучшим литературным журналом Беларуси. "Он привлекает как своим современным дизайном, так и актуальными текстами ведущих писателей страны, среди которых — произведения Светланы Алексиевич и Владимира Некляева", — сказала Ипатова.

По ее словам, гродненская молодежь охотно приобретала журнал и проявляла интерес к литературной жизни страны. "Юноши и девушки показали полную осведомленность о ходе и итогах работы последнего съезда Союза белорусских писателей. Причем, многие из них назвали его выдающимся событием общественно-политической жизни, ибо писатели в полный голос проявили свою гражданскую позицию и неприятие политики, при которой идет наступление на белорусский язык и национальную культуру. Молодежь поддержала нас в стремлении отстаивать введение обязательного экзамена по белорусской литературе и бороться против сужения сферы употребления родного языка", — сказала Ольга Ипатова.

**БелаПАН**

ДЗЯТЛАВА

### ДЗІКУНСТВА

**Жыхарка Дзятлава, грамадзянка В., паскардзілася ў міліцыю, што з магілы яе сястры, якая пахавана на гарадскіх могілках па вуліцы Някрасава, нехта ўкраў надгробніцу з трох перамычак.**

Міліцыя шукае вандала.

### КАМУ СПАТРЭБІЛАСЯ БОЧКА

**Ля жывёлагадоўчай фермы вёскі Харашкі, што ў калгасе "Мяляхавічы" Дзятлаўскага раёна, стаяла алюмініевая бочка ёмістасцю 600 літраў. У адну з кастрычніцкіх начэй яе нехта звалок, як кажуць, без шуму і пылу.**

Супрацоўнікі міліцыі злодзеяў пакуль не знайшлі.

### ЗНОЙДЗЕНЫ ТРУП

**Раніцай ля жывёлагадоўчай фермы вёскі Азяраны Дзятлаўскага раёна мясцовыя жыхары знайшлі труп грамадзяніна Б., якому было 45 гадоў.**

Ён працаваў на ферме вартаўніком. Экспертыза ўстанавіла, што чалавек памёр сам, бо прыкмет гвалтоўнай смерці не выяўлена.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ**

ЗЭЛЬВА

### У НЯДЗЕЛЮ ТАНЦАЎ НЕ БУДЗЕ

**Кожную пятніцу, суботу і нядзелю ў Зэльвенскім РДК праходзілі танцавальныя вечары для моладзі.**

Але нядаўна нядзельныя дыскатэкі адмянілі. Такое рашэнне прыняла адміністрацыя Дома культуры ў сувязі з адсутнасцю ў нядзелю наведвальнікаў.

### ЗАКРЫЛІСЯ АДДЗЯЛЕННІ СУВЯЗІ

**З 16 кастрычніка ў вёсках Чырвонае Сяло, Вострава, Залацеева і паселку Кастрычніцкі закрыліся аддзяленні Зэльвенскага раённага вузла паштовай сувязі.**

Цяпер у раёне працуе 18 аддзяленняў і адзін пункт паштовай сувязі.

**Наталля ГЛУШЭНЯ**

ВОЛКОВЫСК

# БЛОКИРУЮЩИЙ ПАКЕТ АКЦИЙ "БЕЛЛАКТ" ПОЛУЧИТ ГОСУДАРСТВО

**Государство согласилось стать акционером волковысского предприятия "Беллакт", получив блокирующий пакет акций ОАО в 25 процентов за сумму порядка 1,8 млн. долларов США.**

Как сообщил БелаПАН главный инженер ОАО "Беллакт" Генрих Марковский, такое решение принято 15 октября на общем собрании акционеров, на котором был рассмотрен вопрос о проведении дополнительной эмиссии акций и последующей их продажи в целевом порядке государству. Участники собрания также рассмотрели вопрос о предоставлении новым акционером "Беллакту" в следующем году более 1,5 млн. долларов США в виде займа.

Идею об участии государства в акционировании этого предприятия впервые высказал премьер-министр Геннадий Новицкий во время посещения Волковыска летом нынешнего года. Марковский отметил, что средства, вырученные от продажи четверти акций ОАО, пойдут на модернизацию производства. Это, по его словам, позволит существенно расширить ассортимент выпускаемой продукции и вывести предприятие на качественно новый уровень. Специалисты "Беллакта" рассчитывают обновить его мощности в течение четырех лет.

**Геннадий ШАРИПКИН**

**Справка БелаПАН.**

ОАО "Беллакт" — единственное в стране предприятие по производству детского и диетического питания — введено в эксплуатацию в октябре 1970 года. До февраля 1991 года оно было известно под названием "Молочно-консервный комбинат детских продуктов". Предприятие оснащено комплектным технологическим, холодильным и энергетическим оборудованием производства европейских фирм — "Альфа-Лаваль", "Ниро-Атомайзер", "Весторалия" и других. ОАО "Беллакт" характеризуется высокой степенью механизации и автоматизации технологических процессов. В настоящее время на предприятии работают более тысячи человек.

ГРОДНА

### БАСКЕТБАЛІСТКІ СУДЗЯЦЦА З КЛУБАМ

**У Ленінскім судзе Гродна ізноў разглядаюцца спазыскі баскетбалістак каманды "Алімпія" да кіраўніцтва клуба.**

Нагадаем, што сямёра баскетбалістак "Алімпіі" праз суд патрабуюць ад сваёй каманды выплаты запазычанасці па заробках за сезон 2001-2002 года. На мінулым тыдні прайшлі разгляды спазыскаў Надзеі Дрозд і Ірыны Аўрамчык.


— Я ўпэўнена, што судовае рашэнне будзе на нашу карысць, — сказала карэспандэнту "ПАГОНІ" Надзея Дрозд, — абяцаныя па кантракту грошы нам не выплацілі. Спасылкі на тое, хто як на працягу сезона гуляў, да кантрактавых абавязкаў не маюць ніякага дачынення.

У выпадку задавальнення патрабаванняў, дзяўчаты будуць настойваць на датэрміновым скасаванні кантрактаў з "Алімпіяй".

Нагадаем, што тры тыдні таму суд вынес станоўчае рашэнне па спазыцы Кацярыны Шупляцовай, прымусіўшы "Алімпію" выплаціць сваёй былой баскетбалістцы ўсе запазычаныя грошы.

**pahonia.promedia.by**

ФОТАФАКТ




*Хлеб карыстаецца попытам заўсёды*

ГРОДНА

### КРАЛІ ЗБРОЮ

**Абмежаванне волі з канфіскацыяй маёмасці, такі прысуд быў вынесены двум гродзенскім вайскоўцам за спробу незаконнага гандлю зброяй.**

Лейтэнант Чумакоў і прапаршчык Гайдукевіч, ваеннаслужачыя шостай асобнай механізаванай брыгады, былі затрыманы супрацоўнікамі камітэта дзяржбяспекі падчас спробы рэалізацыі вялікай партыі баявых патронаў.

Міжгарнізонны суд Гродна асудзіў іх адпаведна да чатырох і трох гадоў абмежавання волі з канфіскацыяй маёмасці.

**pahonia.promedia.by**

СВІСЛАЧ

### ПАМІНАННЕ Ў СВІСЛАЧЫ

**У нядзелю, 20 кастрычніка, у Свіслачы прайшло традыцыйнае памінанне Віктара Каліноўскага, брата Кастуся Каліноўскага, ідэолага вызваленчага паўстання 1863-1864 г.г., які заўчасна памёр за некалькі месяцаў да пачатку паўстання.**

Сёлета ў мястэчка з'ехаліся прадстаўнікі рэгіёнаў Гродзенскай вобласці: Гродна, Слоніма, Мастоў, Ваўкавыска, Зэльвы, Бераставіцы. Спачатку яны ўсклалі кветкі на магілу Віктара Каліноўскага, якую гродзенскія і мясцовыя грамадскія актывісты адшукалі і аднавілі сем гадоў назад. Ускладанне кветак адбылося таксама ля помнікаў кіраўнікам паўстання Кастусю Каліноўскаму і Траўгуду. Затым гаспадары і госці наведалі Якушоўку, сялібу Каліноўскіх. Гэтыя муры адшукаў доктар гістарычных навук Міхась Ткачоў. Абставіны і нечаканая смерць памяшалі яму аднавіць будынак.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

ЗЕЛЬВА

### УМЕРЛА ОТ ПОБОЕВ

**46-летний житель деревни Шейки Зельвенского района избил палкой свою сожительницу.**

От тяжких телесных повреждений 53- летняя женщина скончалась. Ведется проверка.

**Наталья ГЛУШЕНЯ**

МАСТЫ

# КНІГА ПРА ХРОНІКУ НАШАГА ЖЫЦЦЯ

**Выйшла ў свет гісторыка-дакументальная хроніка Мастоўскага раёна. Восьмая па ліку кніга з гэтай серыі ў Гродзенскай вобласці. Выдадзены хронікі г.Гродна, Гродзенскага, Бераставіцкага, Дзятлаўскага, Навагрудскага, Карэліцкага і Шчучынскага раёнаў.**

Сёння карэспандэнт "Газеты Слонімскай" гутарыць з укладальнікам кнігі Аляксеем Сабасцянам.

**— Скажыце, хто ініцыятар стварэння кніг "Памяць" — гісторыка-дакументальных хронік раёнаў і гарадоў Беларусі?**

— Ініцыятыва ўзнікла яшчэ пры кіраўніцтве Пятра Машэрава, які быў першым сакратаром ЦК КПБ. Вядома, ініцыятыву на месцах у свае рукі ўзялі партыйныя органы. З распадам партыі справа перайшла да райвыканкамаў. Выданне кніг "Памяці" то заціхала, то ажывала. Але, калі быў створаны спецыяльны арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гістарычна-дакументальных хронік "Памяці" пад эгідай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, справа пайшла больш арганізавана. Хаця трэба сказаць, што найменш хронік выдадзена на Гродзеншчыне. Няма хронік такіх знакамітых гарадоў як Ліда, Слонім, Смаргонь, Ашмяны.

**— Хто займаўся напісаннем кніг "Памяць. Мастоўскі раён"?**

— Для напісання кнігі гэтай серыі стваралася спецыяльныя раённыя камісіі. У іх склад ўваходзілі кіраўнікі буйных арганізацый і ўстаноў, людзі, якія звязаны з краязнаўствам і добра ведаюць раён. Назаву некаторых з іх. Гэта — Анатоль Мікалаевіч Быліч, былы намеснік старшыні райвыканкама, а зараз дырэктар Правамастоўскай спецшколы-інтэрната, кіраўнік раённай ветэранскай арганізацыі Леанід Вікенцьевіч Варац, настаўнік СШ №5, які займаецца пошукавай працай, Анатоль Антонавіч Місюк, заслужаны настаўнік РБ з Лунна Мсціслаў Уладзіміравіч Семак, краязнаўца Сяргей Афанасьевіч Суравец з Мастоў і іншыя. За час стварэння кнігі мяняўся склад камісіі. У апошні час старшынёй камісіі быў кіраўнік райвыканкама Аляксандр Рыгоравіч Кісялёў, намеснікам — намеснік старшыні райвыканкама Таісія Мікалаеўна Мурына.

**— Што стала крыніцай матэрыялаў да хронікі?**

— Крыніцы былі самыя разнастайныя. У першую чаргу, архівы. Шмат матэрыялаў выкарыстаны з Гродзенскіх архіваў, а таксама з архіваў Мінска і Масквы. Давялося перагарнуць шмат друкаваных выданняў розных гадоў — кніг, часопісаў, газет. Але галоўная крыніца інфармацыі — чалавечая памяць. Таму давялося сустракацца са шматлікімі людзьмі, якія памятаюць знамянальныя падзеі, асабліва звязаныя з вайной. У кнізе шмат успамінаў.

**— Колькі часу цягнулася праца па напісанню і ўкладанню кнігі "Памяць"?**

— Даволі працяглы час. Справа ў тым, што даводзілася пачынаць з нуля. Вучоны свет больш цікавіўся вядомымі мясцінамі Гродзеншчыны, такімі як Ліда, Ваўкавыск, Слонім... Масты адносіліся да другарадных пасяленняў. Аднак, патугі засведчылі, што і мы не лыкам шытыя, а маем багатую і самабытную гісторыю. На напісанне кнігі пайшоў добры дзесятак гадоў.

**— Ці ўсе сабраныя матэрыялы ўвайшлі ў кнігу "Памяць. Мастоўскі раён"?**

— Вядома, сабрана вялікая колькасць матэрыялаў. Нажаль, аб'ём кнігі не дазволіў змясціць усё, што мелася. Адны матэрыялы наогул былі зняты з кнігі, другія — скарочаны, два або тры артыкулы аб'ядноўваліся ў адзін ці далучаліся да іншых. Шкада, вядома, але гэтага патрабавала энцыклапедычнасць выдання. Якi далейшы лёс матэрыялаў, якія засталіся, цяжка сказаць. Думаю, калі іх скарыстаць, то можна выдаць яшчэ асобную кнігу пра наш край. Бо сёння гісторыяй родных мясцін цікавяцца як дарослыя, так і падлеткі.

**— Хто займаецца распаўсюджваннем кнігі? Ці змогуць набыць яе ўсе жадаючыя?**

— Пытанне вельмі надзённае. "Памяць" выдадзена накладам у тры тысячы паасобнікаў. Быццам нямала. Аднак трэба ўлічваць, што яна павінна быць у бібліятэках, школах. Пэўная частка тыражу будзе аддадзена ў продаж. Паколькі кніга выдадзена на сродкі раённага і абласнога бюджэтаў, то размеркаваннем яе займаецца райвыканкам. Зараз рыхтуецца прэзэнтацыя кнігі. Лічу, што "Памяць" павінна быць настольнай кнігай у кожнай сям'і, у кожнай хаце. Тым больш, што перавыданне хронікі не прадугледжана.

**— Якія планы на будучыню?**

— Хацелася б, каб прадоўжылася выданне кніг пра Мастоўшчыну. У ходзе збору матэрыялаў для "Памяці" назапасілася шмат карыснага. У мяне, як складальніка кнігі "Памяць", сабраны матэрыялы для кнігі "Біяграфія вёсак Мастоўшчыны", фальклорныя матэрыялы для выдання "Спявае Мастоўшчына". А чаму не выдаць кнігу "Энцыклапедыя Мастоўшчыны", у якой размясціць рознабаковыя матэрыялы пра родны край. Запэўніваю, што новае выданне не паўторыць змест кнігі "Памяць. Мастоўскі раён", а, наадварот, пашырыць хроніку пра родны край.

**Гутарыў Язэп ПАЛУБЯТКА**

ОБРАЗОВАНИЕ

# НОВОЕ ПОЛОЖЕНИЕ О ЗОЛОТЫХ И СЕРЕБРЯНЫХ МЕДАЛЯХ




Фота Віталя ГІЛЯ

*Пятёрка — уже не очень хорошая отметка. На медаль нужно больше*

**Правительство Беларуси утвердило Положение о золотых и серебряных медалях "За отличные результаты в учебной деятельности" и похвальной грамоте "За особые успехи в изучении отдельных предметов".**

Как сообщил БелаПАН начальник Главного управления общего среднего образования Министерства образования Владимир Щербо, документ принят в связи с переходом учреждений среднего образования на 10-балльную систему оценки знаний. В нем указаны баллы, при получении которых ученику выдается золотая или серебряная медаль. При этом принцип награждения медалями и похвальной грамотой остался прежним.

Так, в частности, золотой медалью награждаются выпускники 11 (12) классов, имеющие годовые оценки "10" (превосходно) и "9" (отлично) по всем предметам, кроме физкультуры, допризывной и медицинской подготовки, по которым оценка должна быть не ниже "6" (хорошо) за время обучения в 10 (11) и 11 (12) классах. Серебряной медалью награждаются выпускники, которые претендовали на золотую медаль, но на выпускных экзаменах получили одну-две оценки не ниже "6". Право на серебряную медаль также имеют выпускники, получившие годовые оценки "10" и "9" по всем предметам, кроме физкультуры, допризывной и медицинской подготовки и другим двум предметам, по которым оценка должна быть не ниже "6".

На общих основаниях медалями награждаются выпускники школ эстетической направленности, имеющие годовые и экзаменационные отметки по профилирующим предметам не ниже "6".

Выпускники, добившиеся выдающихся успехов в изучении одного-двух предметов и имеющие годовые и экзаменационные оценки "10" и "9", а также не ниже "6" по другим предметам, награждаются похвальной грамотой.

**Ольга ОСИПЕНКО**

ОБЩЕСТВО

## СТРАНА РАБОТАЮЩИХ ПЕНСИОНЕРОВ

**По данным на 1 сентября нынешнего года, практически каждый пятый житель страны после выхода на заслуженный отдых продолжает трудовую деятельность.**

Это обусловлено, в первую очередь, невысоким уровнем пенсии, средний размер которой составляет 80,4 тысячи рублей. Кстати, из общего числа пенсионеров (а их в Беларуси на 1 сентября было свыше 2 миллионов 477 тысяч человек) минимальную пенсию получают 359 тысяч. Как сообщили корреспонденту БЕЛТА в Министерстве труда и социальной защиты, в нынешнем году снижается соотношение численности работников-плательщиков страховых взносов и пенсионеров, связанное с ухудшением демографической ситуации. В результате, если на 1 января на каждых 100 пенсионеров приходилось 168 работающих, то на 1 сентября — 165.

**Наталья ФУРСОВА**

КРИМИНАЛ

## 11 000 ПОПАЛИ ПОД СТАТЬЮ

**На предприятиях агропромышленного комплекса (АПК) за 9 месяцев нынешнего года был выявлен ущерб от недостач и хищений, незаконных расходов денежных средств и материальных ценностей в сумме 5 миллиардов рублей.**

По материалам ревизий к дисциплинарной и материальной ответственности привлечено 11 тысяч должностных лиц, а 97 специалистов освобождены от занимаемой должности. К уголовной ответственности за подобные преступления привлечено 778 лиц. Эти цифры прозвучали на заседании коллегии Минсельхозпрода, где рассматривались проблемы сохранности государственной собственности.

**ХАРТИЯ-97**

ОБЩЕСТВО

## НЕ МОГУТ ПОЗВОЛИТЬ СЕБЕ РОЖАТЬ

**В Беларуси ежегодно только 3,5 процента женщин детородного возраста становятся матерями.**

Такую цифру назвал главный акушер-гинеколог Министерства здравоохранения Владимир Силява на заседании "круглого стола", состоявшегося в Общественном пресс-центре Дома прессы.

А обсудить здесь проблемы материнства и детства собрались представители ряда министерств и ведомств, общественных организаций республики.

## 60 % БЕЛОРУСОВ НЕ УМЕЮТ РАБОТАТЬ НА КОМПЬЮТЕРЕ

**60 процентов жителей Беларуси не умеют работать на компьютере, 40 процентов — умеют.**

Таковы данные республиканского зондажа общественного мнения, проведенного в сентябре учеными Института социологии и социальных технологий Национальной академии наук Беларуси. Было опрошено более полутора тысяч граждан республики 16 лет и старше.

**Наталья ФУРСОВА**

ЭКОНОМИКА

## ПРОБЛЕМЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ

**Проблема формирования размера арендной платы за помещения при сдаче их индивидуальным предпринимателям обсуждалась на очередном заседании рабочей группы по проблемным вопросам, связанным с предпринимательской деятельностью.**

Как сообщил БелаПАН вице-президент Белорусского союза предпринимателей (БСП) Михаил Шавельзон, принимавший участие в заседании, 16 октября прошло совещание у заместителя премьер-министра — министра экономики Андрея Кобякова, на котором также рассматривался этот вопрос. Таким образом, по словам М.Шавельзона, высказанные представителями бизнес-ассоциации соображения приняты и стали прорабатываться в правительстве.

Он считает, что процесс формирования ставок арендной платы должен быть "прозрачным, внятным и экономически обоснованным", и приветствует желание представителей правительства разобраться с этим вопросом.

В ходе заседания рабочей группы вновь обсуждался проект поправок к декрету № 18. По словам М.Шавельзона, с правительством пока не удается договориться о размерах социальных взносов, которые должны будут платить индивидуальные предприниматели. Не находит пока поддержки и идея эксперимента по введению в Беларуси накопительных пенсионных счетов для индивидуальных предпринимателей. Министерство труда и социальной защиты настаивает на том, чтобы страховые взносы составляли 36 процентов от бюджета прожиточного минимума (около 30 тыс. рублей). Эксперты БСП предлагают установить размер взноса на уровне 10 евро (сейчас это примерно 18.500 рублей) или одной базовой величины (11.100 рублей).

> "... с правительством пока не удается договориться о размерах социальных взносов, которые должны будут платить предприниматели."
>
> **М. Шавельзон**

**Юлия ШАРОВА**

ОБЩЕСТВО

## ЧТО СЕЛЯНИНУ БОГАТСТВО, МИНЧАНИНУ – ПРОЖИТОЧНЫЙ МИНИМУМ

**По данным министерства статистики и анализа Беларуси, самые высокие средние потребительские расходы семей зарегистрированы в Минске – 325 тыс. бел. руб.**

В других крупных городах страны этот показатель составил 240,1 тыс. бел. руб. В небольших городах районного значения – 209,9 тыс. бел. руб., а в сельской местности – 159,9 тыс. руб. Таким образом, столица опережает по потребительским расходам глубинку более чем в два раза.

В структуре расходов среднестатистической семьи 53,8% составляют продукты питания. Транспорт и связь – 9,6%. Одежда, обувь и ткани – 8,4%. Жилищно-коммунальные услуги – 5,9%. Товары культурно-бытового назначения и мебель – 4,4%.

А вот расходы на культуру, отдых и спорт, как и на покупку алкогольных напитков, совпадают – по 3%.

> ... столица опережает по потребительским расходам глубинку более чем в два раза.

**ХАРТИЯ-97**

## НАЧАЛА РАБОТАТЬ НОВАЯ СЛУЖБА "ПРАВА ПАЦИЕНТА"

**В спектре услуг, оказываемых общественным объединением "Минское общество потребителей" (МОП), появилась новая служба "Права пациента".**

Как сообщила БелаПАН юрист МОП Екатерина Орловская, новая услуга ориентирована на защиту прав потребителей платных медицинских услуг и лекарственных препаратов. По ее словам, в последнее время перечень платных медицинских услуг с каждым днем расширяется, однако их качество не всегда соответствует требованиям. Каждый обратившийся в МОП, отметила специалист, получит квалифицированную консультацию юриста. Кроме того, специалисты общества потребителей при необходимости окажут помощь при подаче искового заявления в суд, а также будут вести дело в качестве представителя от имени пострадавшего пациента в судебном заседании. За помощью в МОП могут обращаться пациенты, которым были оказаны некачественные платные медицинские услуги.

Как отметила Орловская, для того, чтобы принять меры на основе обращения, пациент должен предоставить документальное подтверждение: чек об оплате услуг, запись в медицинской книге, рентгеновские снимки, результаты анализов и другие доказательства. Если жалоба пациента обоснована, юристами будет составлена претензия, а, в случае необходимости, вопрос будет решен в судебном порядке.

> ... в последнее время перечень платных медицинских услуг с каждым днем расширяется, однако их качество не всегда соответствует требованиям.

**Ольга ОСИПЕНКО**

## ВНИМАНИЕ!

В «Газеце Слонімскай» **действуют следующие цены на рекламные услуги:**

Строчная (частная) реклама — **3050 руб.**,
Поздравление — **4310 руб.**,
Поздравление с фото — **4690 руб.**,
Соболезнование, благодарность — **2630 руб.**,
Модульная реклама — 1 кв.см — **813 руб.**
Дополнительная плата взимается ЗА СРОЧНОСТЬ + **1000 руб.**;
Поздравление В РАМОЧКЕ + **1000 руб.**;
Реклама, выделенная ЦВЕТОМ, + **30%** от стоимости;
Реклама на 1 и 16 стр. + **50%** от базовой стоимости;
Частная реклама С ФОТО — **5000 руб.**

Вашу рекламу мы также можем разместить в Интернете. Эта услуга стоит + **20%**.
В нашей газете могут поместить поздравление или рекламу жители соседних регионов. Для этого необходимо оплатить стоимость заказанного объявления на наш

**р/с 3013215550011 в АСБ «Беларусбанк», ф. 422 в г. Слониме, код 852 УНН 590079996**

и отправить текст вместе с квитанцией по адресу:
**231800, г. Слоним Гродненской области, ул. Комсомольская, 8, «Газета Слонімская» или по факсу 2-49-39.**

Последний срок подачи заявлений на публикацию в текущий номер —
**понедельник 18.00.**

**Время работы рекламного отдела с 9.00 до 18.00, выходной — суббота, воскресенье — с 12.00 до 17.00.**

---

**Центр вспомогательной репродукции "ЭМБРИО", ОДО "БелИвПул"**

**Только у нас!**
**Все виды и этапы лечения проводятся в Минске.**
**Для пациентов проходивших лечение в любых центрах мира на технологии ЭКО предоставляем скидки до 20%.**

**1.** Лечение бесплодия методом экстракорпорального оплодотворения (ЭКО).
1.1. Классический метод ЭКО.
1.2. ЭКО с использованием замороженных гамет.
1.3. ЭКО с использованием донорских гамет.
1.4. ЭКО при выраженной олигоастенозооспермии.
1.5. ЭКО с применением микроманипуляций (ИКСИ) – при наличии даже единичных спермотазоидов в эякуляте).
1.6. ЭКО ИКСИ с применением сперматозоидов из биопсийного материала – при обтурационной форме азооспермии (отсутствии сперматозоидов в эякуляте).
**2.** Лечение бесплодия методом внутриматочной инсеминации.
2.1. Внутриматочная инсеминация спермой мужа.



2.2. Внутриматочная инсеминация спермой донора.
**3.** Лечение бесплодия методом индукции овуляции (стимуляция яичников).
**4.** Ранняя диагностика беременности.
**5.** Высокоразрешающее цифровое УЗИ.
**6.** Исследование спермы по критериям ВОЗ.
**7.** Ультразвуковой и гормональный мониторинг менструального цикла.
**8.** Обследование на урогенитальные инфекции и лечение воспалительных процессов женской половой сферы.
**9.** Исследование уровня гормонов в крови.
**10.** Квалифицированные консультации врачей акушеров-гинекологов.
**11.** Обследование патологий шейки матки (кольпоскопия, цитология, биопсия).
**12.** Обследование супругов на совместимость (тканевую, по резусу, группе крови).
**13.** Заморозка и длительное хранение спермы.

**Предварительная запись по телефону: (017) 232-60-54, (017) 239-39-91, г. Минск, 220013, пр-т Скорины, 64 (корпус гинекологии 1-ой ГКБ)**

Лицензия №1817 Минздрава РБ, выдана 07.05.2001г., действительна до 07.05.2006г.

---

**ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»**
Генеральная лицензия НБ РБ № 31 от 01.04.2002 г. Общая лицензия НБ РБ № 56 от 01.04.2002 г.



**Филиал №422 г.Слоним**
**БЕЛАРУСБАНК**

ПРИГЛАШАЕТ К ВЗАИМОВЫГОДНОМУ СОТРУДНИЧЕСТВУ ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ

**МЫ ПРЕДЛАГАЕМ ШИРОКИЙ СПЕКТР БАНКОВСКИХ УСЛУГ, В ТОМ ЧИСЛЕ:**
- комплексное обслуживание юридических лиц,
- услуги кредитования (факторинг, лизинг, валютные кредиты, банковские гарантии и поручительства),
- операции с ценными бумагами (вексельные займы, продажа векселей с отсрочкой оплаты, учет векселей).

**НАШ БАНК ОБЕСПЕЧИВАЕТ:**
- гарантированное прохождение платежей день в день;
- проведение по просьбе клиента "срочных" платежей по системе BISS с 9-00 до 16-00;
- возможность обслуживания по электронной системе "Клиент-Банк"
- индивидуальный подход к каждому клиенту;
- самые низкие процентные ставки по кредитам

**ОСОБОЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ для индивидуальных предпринимателей!**
